Гродзенская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма
Філіял №9

# “Шлях мой споўненай долі”

## Да 75-годдзя здня нараджэння Д.І.Бічэль

### Бібліяграфічны спіс



Гродна 2013

**“Шлях мой споўненай долі”. Да 75-годдзя з дня нараджэння Д.І.Бічэль: бібліяграфічны спіс / Гродзенская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма; філіял №9. – Гродна, 2013. -5 с.**

2013 год юбілейны для гродзенскай пісьменніцы Д.І. Бічэль. Прапануем вашай увазе спіс друкаваных матэрыялаў аб жыцці і творчасці пісьменніцы.



## Данута Іванаўна Бічэль
## (г.р.01.01.1938)

Паэтамі не нараджаюцца, паэтамі становяцца. Данута Бічэль не можа не пісаць вершы, бо нарадзілася такой, вельмі чулай да паэзіі, да народнай песні. Імя Данута – значыць “падараваная”, а дакладней – “тая, што даруе”. Тая, у якой “сяброўка…праўдзівасць, старэйшы брат – неспакой, сястрыца…надзея”,-піша ў сваім вершы паэтэса.

1 студзеня 2013 года беларуская пісьменніца адзначыла свой юбілей – 75-годдзе. Паэты не павінны баяцца ўзросту. Кожны іх дзень – гэта мастацкае слова ці вобраз, кожны год жыцця – гэта цэлая страфа біяграфічнага лёсу.

“Мяне маці нарадзіла, як сасонку ў бары пасадзіла”,-так апісвае сваё з’ўленне на свет паэтка. Жыццёвыя пуцявіны пачыналіся з вёскі Біскупцы, што ў Лідскім раёне Гродзенскай вобласці, з сялянскай хаты дзеда па бацькоўскай лініі. Бацька Ян Вікенцьевіч Бічэль, ажаніўшыся, зямельнага надзела не атрымаў, бо быў старэйшым сярод дзяцей, якіх яшчэ трэба было адпраўляць у людзі. Яго жонка Марыя Адамаўна пасагу не прынесла, бо рана асірацела, і зямля перайшла ў спадчыну сястры. Застаўшыся беззямельным, бацька пайшоў зарабляць грошы – ганяў плыты. У выніку набыў кавалак пясчанай зямлі і праз год пасля нараджэння паэткі паставіў уласную хату. У Дануты была старэйшая сястра Рэгіна, таму бацькі асабліва не змушалі яе да працы.  Аднак прыходзілася пасвіць кароў, з-за чаго не атрымлівалася рэгулярна вучыцца. Але цяга да адукацыі была вельмі моцная. Першыя школьныя гады прабеглі ў родных Біскупцах, у звычайнай сялянскай хаціне. Вось тады, у школьную пару і пачалі нараджацца ў душы вершы. Першае, што натхніла Дануту на творчасць, былі матчына слова і страха

вясковай хаты. Гэтыя фактары сталі найбольш істотнымі для таго, каб знайсці сябе на ніве беларускага пісьменства. Сур'ёзна пісаць дзяўчына пачала з пятага класа, але ўпотай ад усіх, толькі для сябе. Чытала тады не шмат. Сярод ранніх кніжак – Янка Купала, Адам Міцкевіч, Генрых Сянкевіч.

На развіццё паэтычнага адчування істотна паўплывала родная песня, якая чулася адусюль: хораша спяваў бацька, сястра, цёткі, суседзі, аднавяскоўцы. Песню і малітвы Данута і лічыла вытокам сваёй творчасці.

У 1953 годзе Данута паступіла ў Лідскае педвучылішча. Тут чытала са сцэны свае творы, аднойчы нават у прысутнасці самаго Кандрата Крапівы. Мела ўжо два сшыткі сваіх вершаў. У 1957 годзе стала студэнткай гісторыка-філалагічнага факультэта Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Я.Купалы. У 1958 годзе адбылося першае выступленне ў друку: газета "ЛіМ" змясціла яе верш "Роднае слова". А ў 1961 студэнтка чацвёртага курса з хваляваннем трымала ў руках свой першы зборнік лірыкі "Дзявочае сэрца".

Пакаленне Бічэль прыйшло ў літаратуру з гарачым жаданнем сцвердзіць нацыянальна-патрыятычныя і гуманістычныя каштоўнасці жыцця як самыя значныя. Шчырасць памкненняў, грамадзянская адказнасць, прага справядлівасці, духоўнасці, свабоды асобы, шанаванне роднага – усё гэта было запатрабавана грамадскімі настроямі, якія не прымалі афіцыёзных прынцыпаў.

Паэтэса хутка творча расла, фарміравалася як індывідуальнасць. Яе ранні настаўнік Васіль Быкаў працаваў тады у "Гродзенскай праўдзе" і ніколі не крытыкаваў яе твораў. А вось на пахвалу не скупіўся. Калі Данута напісала паэму "Жыта", Васіль Уладзіміравіч прачытаў яе і сказаў так: "У цябе была форма, як вядзёрка, - і ты насыпала туды сунічак. Атрымалася поўнае і з вяршком".

Данута Бічэль была заўсёды вельмі гасцінным і шчырым чалавекам. Хто толькі з пісьменнікаў не пабываў у яе кватэры на вуліцы Паповіча! І Ларыса Геніюш, і Васіль Быкаў, і Рыгор

Барадулін, і Пятро Макаль, і Сяргей Панізнік, і многія іншыя. Гаварылі пра жыццё і літаратуру, і кожны пачуваўся роўным і вольным у ацэнках і меркаваннях.

У другой палове 60-х і ў 70-я гады Данута Янаўна шмат падарожнічала па розных мясцінах Беларусі. Часцей за ўсё яна наведвалася ў Зэльву, дзе жыла Ларыса Геніюш, якая моцна паўплывала на станаўленне Дануты Бічэль як асобы і як паэткі.

Прыкметныя зрухі ў творчасці пісьменніцы адбываюцца ў кнігах сямідзесятых гадоў “Доля” (1972), “Ты – гэта ты”(1976), “Браткі” (1979). Асноўнай тэмай паэзіі становяцца вясковы побыт з яго звычаямі і рытуаламі. Вершы гэтага часу напоўнены светам прыроды. Бляск сонца, вока вадаёма, баравіковы неруш, месяца жоўтае кола – усё гэта прыемна ўзрушвае жаночую душу, а ў зборніку “Ты – гэта ты” ёсць цэлы раздзел вершаў пра малавядомыя беларускія кветкі, птушак, насякомых, жывёл, якія ўтвараюць асаблівую паэтычную ауру жыцця Беларусі.

У кніжках 80-х гадоў “Дзе ходзяць басанож” (1983), “Загасцінец” (1985) і “Даўняе сонца” (1987) гаворыць каханне. Тут яно – сталае, глыбокае пачуццё жанчыны, што зведала цану жыцця.

Паэтычная творчасць Д. Бічэль-Загнетавай спалучаецца з грамадска-асветніцкай дзейнасцю. Скончыўшы ў 1962 г. Гродзенскі педінстытут, працавала настаўніцай у Гродне, у 1982 г. зацвярджаецца на пасадзе старшага навуковага супрацоўніка Гродзенскага абласнога гістарычна-археалагічнага музея і пачынае рыхтаваць да адкрыцця музей М. Багдановіча. Збірае матэрыялы, складае планы экспазіцый, думае, шукае. Прайшлі гады, пакуль экспазіцыя была сфармавана. Музей М. Багдановіча ў Гродна адкрыты ў 1994 г., і дырэктарам яго да 1998 г. працавала менавіта Д. Бічэль. Тут ладзіліся творчыя вечарыны, літаратурныя прэзентацыі, сустрэчы з цікавымі гасцямі горада.

У 1984 годзе Данута Бічэль стала лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы. Гэта ацэнка творчага ўздыму, адзнака ўвагі да паэзіі жыхаркі Гродна.

Плённая праца 90-х гадоў адзначана зборнікамі паэзіі “А на Палессі…” (1990), “Ты не самотны…”(1997) і “Снапок” (1999). У зборніку “На Палессі…” паэтэса даследуе беларускую гісторыю. Яна жыве лёсамі выдатных асоб мінулага – Еўфрасінні Полацкай, Усяслава Чарадзея і Кастуся Каліноўскага.

Апошнія гады для паэткі былі вельмі цяжкімі. Разбураліся мары і апошнія спадзяванні, адыходзілі ў нябыт сапраўдныя сябры. Таму ў гэты час нараджаюцца, у большасці сваёй, духоўныя вершы, якія ўваходзяць у зборнік “На белых аблоках сноў” (2002). У іх здейсніўся шлях праз жыццё і паэзію, разам са словам матчыным і боскім, шлях да сябе і да Бога.

У 2008 годзе выйшла кніга Данута Бічэль “Хадзі на мой голас”. Гэта не вершы і не проза, а, як сама Данута Бічэль кажа, гэта яе эсэйкі – успаміны пра сябе, бацькоў, пра творцаў, якія мелі дачыненне да Гродзенскай зямлі. “Гэтая кніжка – яшчэ не развітанне, не запавет, але падвядзенне вынікаў”,- адзначае пісьменніца.

Будзем чакаць працяг гэтага цікавага праекта і новых твораў пісьменніцы.

**“Заходзьце да мяне, хто ў смутку, душа кніжкі заўсёды адчынена”…**

**Данута Бічэль**









# Творы Дануты Бічэль

1. Бічэль-Загнетава, Д.І. А на Палессі: вершы і балады /Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990.- 157 с.
2. Бічэль-Загнетава, Д.І. Браткі: вершы і паэмы /Данута Іванаўна Бічэль.- Мінск: Мастацкая літаратура, 1979.- 240 с.
3. Бічэль-Загнетава, Д.І. Габрунька і Габрусь: вершы /Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава. - Мінск: Юнацтва, 1985.- 40 с.
4. Бічэль-Загнетава, Д.І Гараднічанка: вершы /Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава. -Мінск: Юнацтва, 1985.- 40 с.
5. Бічэль-Загнетава, Д.І. Даўняе сонца: лірыка /Данута ІванаўнаБічэль-Загнетава.-Мінск:Мастацкая літаратура, 1987.- 398 с.
6. Бічэль-Загнетава, Д.І. Дзе ходзяць басанож: вершы / Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава. –Мінск: Мастацкая літаратура, 1983. – 95 с.
7. Бічэль-Загнетава, Д.І. Загасцінец: вершы /Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава. –Мінск: Мастацкая літаратура, 1985. – 94 с.
8. Бічэль-Загнетава, Д.І. Лузанцы: вершы /Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава. - Мінск: Юнацтва, 1982.- 40 с.
9. Бічэль, Д.І. Снапок: выбраныя вершы /Данута Іванаўна Бічэль. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1999. – 446 с.
10. Бічэль-Загнетава, Д.І. Ты – гэта ты: паэзія / Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава. –Мінск: Мастацкая літаратура, 1976. – 176 с.
11. Бічэль, Д.І. Хадзі на мой голас /Данута Іванаўна Бічэль.- Wroclaw:WroclawkaDrukarniaNaukowaPANim. S.Kulczynskiego, 2008.- 327 с.

# Пра жыццё і творчасць Д.І. Бічэль

## Кнігі

12. Бічэль Данута Іванаўна //Беларуская энцыклапедыя: у 18 т.- Мінск, 2000.- Т. 3.- С. 64.
13. Бічэль Данута Іванаўна //Беларускія пісьменнікі: бібліягр. слоўн.: у 6 т. / пад рэд. А.В. Мальдзіса.- Мінск.- 1994.- Т. 1.- С. 282-288.
14. Бічэль Данута Іванаўна //Вытокі песні: аўтабіяграфіі беларускіх пісьменнікаў.- Мінск: Мастацкая літаратура, 1973.- С. 24-26.
15. Раманчук, А. ”Край наш трымаецца на апантаных”…: [пра творчасць Д.І.Бічэль] /А.Раманчук //Галасы 3: штогоднік.- Гродна, 2004.- С. 298-303.
16. Чабан, Т. Крылы рамантыкі: рамантычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай паэзіі /Т. Чабан.- Мінск: Навука і тэхніка, 1982.- С. 73-75, 111-113.
17. Чабан, Т.К. Сучасная паэзія і фальклор /Т.К. Чабан, Я.А. Гарадніцкі. - Мінск: Навука і тэхніка, 1988.- С. 24-26, 33-35, 52-54, 61-64.

## Артыкулы

18. Бічэль, Д. Чалавек, які выконвае сваю місію: [гутарка з Данутай Бічэль] /гутар. Андрэй Масквін //Дзеяслоў.- 2010.- № 5.- С. 257-262.
19. Бур’ян, Б. “Каб песняй пра сябе сказаць”: [пра зборнік вершаў Д.І. Бічэль-Загнетавай “Загасцінец”] /Барыс Бур’ян //Полымя.- 1986.- № 12.- С. 206-208.
20. Весялуха, М. Час будаваць масты /Марына Весялуха //Дзеяслоў.- 2011.- № 1.-С. 288-289.- Рэц. на кн.: Бічэль Д. Мост святога Францішка: успаміны.- Мінск: Медысонт, 2010.- 290 с.
21. Дамашэвіч, У. Пра родны кут і яго насельнікаў: [водгук на кнігу Д.Бічэль “Хадзі на мой голас”] /

Уладзімір Дамашэвіч // Полымя.- 2009.- № 3. - С. 175-177.
22. Заяц, Н. “Каб з мінулага ў будучыню загудзелі масты”: паэтычны зборнік “А на Палессі” Дануты Бічэль / Наталля Заяц // Роднае слова.- 2007.- № 12.-С.7-9.
23. Карнялюк, К. “Сніцца мне хатка”…: [аб новай кнізе Д. Бічэль “Снапок”] /К. Карнялюк //Гродзенская праўда.- 2000.- 22 жн.- С. 3.
24. Кісель, А. Асаблівасці функцыянальнай семантызацыі /характарызацыі асабовых займеннікаў: на матэрыяле паэтычных тэкстаў Дануты Бічэль /Алена Кісель //Роднае слова.- 2013.- № 1.- С. 37-39.
25. Марціновіч, А. Тутэйшая: [пра творчасць Д. Бічэль] /Алесь Марціновіч //Крыніца.-1998.- № 11.- С. 18-20.
26. “На высокім цярпенні згару: Данута Бічэль: [сціслыя біяграфічныя звесткі; нізка вершаў] //Роднае слова.- 2013.- № 1.- С. 24-26.
27. Нікіпорчык, А. Служэнне слову і Айчыне: [пра жыццё і творчасць Д.І. Бічэль] /Ала Нікіпорчык //Маладосць.- 2007. - №12.- С. 95-100.
28. Новік, М. “З намі Нёман, з намі Бог…”: малітоўнае слова Дануты Бічэль: [пра кнігу Д. Бічэль “Нядзелька”] /М. Новік //Роднае слова.- 2007. - №6.- С. 57-59.
29. Паэты складаюць трэцюю ступень святарства… //Літаратура і мастацтва.- 2008.- 17 кастр. (№ 42).- С.16. – Рэц. на кн.: Бічэль Д. Хадзі на мой голас.- Wroclaw: WroclawkaDrukarniaNaukowaPANim. S. Kulczynskiego, 2008.- 327 с.
30. Петрушкевіч, А. “Абнімаюць рукі Беларусь”: творчасць Дануты Бічэль-Загнетавай /Ала Петрушкевіч // Роднае слова.- 1993.- № 1.- С. 6-12.
31. Раманчук, А. “Край наш трымаецца на апантаных”…: [творчы партрэт Д. Бічэль] / А. Раманчук // Гродзенская праўда.- 2003.- 14 студз.- С. 3.

32. Фенчанка, Н. “Я тутэйшая, я звычайная…”: да 70-годдзя з дня нараджэння Дануты Бічэль: [аб жыцці і творчасці Дануты Бічэль] / Н. Фенчанка //Бібліятэчны свет.- 2008.- № 1.- С. 29-30.
33. Янішчыц, Я. Дома!: [пра кнігу Д. Бічэль-Загнетавай “Даўняе сонца”] /Яўгенія Янішчыц //Маладосць.- 1988.- № 1.- С. 109-172.

Складальнік: Аўдзяевіч В.У.
Рэдактар: Ілюшына І.М.
Адказны за выпуск: Камарова М.А.

